вытворчых і рэстаўрацыйных майстэрнях, а таксама ў праектных арганізацыях, галіновых лабараторыях.

Прафесійная дзейнасць у галіне рэстаўрацыі і кансервацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва азначае не толькі авалодванне ў працэсе навучання адпаведнымі ведамі і ўменнямі, але і развіццё здольнасцей, якія садзейнічаюць далучэнню да твораў мастацтва, і глыбокае пазнанне прыроды. Таму абітурыенты, што выбіраюць дадзеную спецыяльнасць, павінны прадэманстраваць валоданне пэўнымі ведамі і ўменнямі ў выяўленчым мастацтве, гэта дазволіць ім удзельнічаць ва ўступных конкурсных экзаменах.

Вяртанне да новага жыцця твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – напружаная, доўгая, карпатлівая работа, якой папярэднічаюць сістэматызаванае вывучэнне і даследаванне прадметаў рэстаўрацыі з розных бакоў – гістарычнага, мастацкага, тэхналагічнага, функцыянальнага і інш. Служэнне рэстаўрацыйнаму мастацтву патрабуе ад спецыялістаў пастаяннай работы па ўдасканальванні прафесійнага майстэрства і поўнай самаадачы.

Будучыя спецыялісты ў галіне рэстаўрацыі і кансервацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва павінны ўнесці свой уклад у гуманізацыю грамадства, павышэнне культурнага патэнцыялу нашага народа, развіццё мастацкіх здольнасцей і творчага пачатку кожнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.В.Шунейка,** *выкладчык*

# ТЭХНАЛАГІЧНЫЯ ПРЫЁМЫ АСОБАСНА АРЫЕНТАВАНАГА НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА НЕФІЛАЛАГІЧНЫХ ФАКУЛЬТЭТАХ

Узаемаадносіны паміж людзьмі ажыццяўляюцца з дапамогай вуснай і пісьмовай мовы. Каб стасункі былі больш зразумелыя і дасканалыя, трэба валодаць культурай маўлення – уменнем

правільна, дакладна і лагічна гаварыць. Задача выкладчыкаў беларускай мовы – навучыць студэнтаў карыстацца ўсім багаццем роднай мовы.

Успрыманне мовы, здольнасці да яе вывучэння, а таксама артыкуляцыйная база – усё гэта ўтвараецца ў кожнага чалавека індывідуальна. Таму падыходзіць да вывучэння мовы трэба асобасна арыентавана.

Адной з характарыстык асобасна арыентаванага навучання з'яўляецца стварэнне адукацыйнай прасторы, дзе асноўнай дзеючай асобай з'яўляецца студэнт. Адукацыйная прастора і навучанне не могуць быць агульнымі для ўсіх. Таму заданні і практыкаванні кожнаму студэнту прапануюцца ў залежнасці ад ступені складанасці, з улікам выбару, ступені яго творчасці, магчымасці хутка выканаць заданне, зацікаўленасці тэматыкай задання, прафесійнай значнасці тэксту і інш.

У такім навучанні дапамагаюць розныя тэхналагічныя прыёмы. У псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры пытанні адукацыйнай тэхналогіі і тэхналагічных прыёмаў навучання разглядаюцца В.П.Бяспалькам, В.В.Гузеевым, Г.К.Селяўко, М.М.Левінай, А.С.Прутчанковым і інш.

Прыём – гэта адносна закончаны элемент тэхналогіі, які зафіксаваны ў агульнай ці асабістай педагагічнай культуры; спосаб педагагічных дзеянняў у пэўных умовах.

В.В. Гузееў, напрыклад, у рабоце «Педагагічная тэхніка ў кантэксце адукацыйнай тэхналогіі» (М., 2001) вылучае экстраактыўныя, інтэрактыўныя і інтраактыўныя тэхналагічныя прыёмы. У аснове гэтага вылучэння ляжаць спосаб інфармацыйнага абмену, інфармацыйны рэжым навучання. Кожнаму інфармацыйнаму рэжыму адпавядае пэўны комплекс прыёмаў.

1. Экстраактыўны рэжым характэрны для лекцыі. Усе інфармацыйныя патокі цыркулююць па-за аб'ектам навучання ці накіраваны да яго. Тэхналагічныя прыёмы могуць быць розныя. Напрыклад, па тэме "Спалучэнні галосных у іншамоўных словах"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчыма слоўнікавая дыктоўка, прычым дыктуюцца не словы, а іх значэнні:

*Новае слова ці словазлучэнне, якое з'явілася ў мове для абазначэння новага паняцця (неалагізм). Правілы літаратурнага вымаўлення (арфаэпія). Аматар, знаўца, збіральнік рэдкіх выданняў кніг (бібліяфіл). Навука, якая вывучае быт і культуру даўніх часоў па знойдзеных шляхам раскопак рэчавых помніках (археалогія). Прысваенне аўтарства на чужы твор літаратуры, навукі, мастацтва або выкарыстанне ў сваёй працы чужога твора без спасылкі на аўтарства (плагіят).*

Мэтазгодна выкарыстоўваць не толькі тэрміны адпаведнай тэмы і кірунку, але і словы агульнакультурнага дыяпазону.

Прыёмы дадзенай групы дазваляюць трэніраваць памяць, ведаць значэнне слова, правільна ўжываць яго.

2. Пры інтэрактыўным рэжыме інфармацыйныя патокі двухбаковыя, дыялагічныя. Гэты рэжым характэрны для такіх формаў арганізацыі навучання, як практычныя і семінарскія заняткі, гутарка, кансультацыя. Сярод прыёмаў атрымання інфармацыі вылучаецца тэхніка "правакацыйных пытанняў", якая дазваляе выяўляць, ці сапраўды асэнсавана валодае студэнт матэрыялам.

*Выкладчык просіць растлумачыць, чаму назоўнік мае катэгарыяльнае значэнне колькасці, ліку? Тут заведама памылковае сцвярджэнне: "Назоўнік мае катэгарыяльнае значэнне колькасці", падаецца як праўдзівае ды яшчэ і з патрабаваннем абгрунтаваць яго.*

*Студэнты, каб не памыліцца, пачынаюць больш свядома ставіцца да вучэбнага матэрыялу.*

Яшчэ адзін прыклад інтэрактыўнага прыёму, які выкарыстоўваецца на практычных занятках. Ён з'яўляецца ўзорам "цяжкага" стылю.

*Амерыканцы любяць выхваляцца сваёй свабодай і дэмакратыяй, а рускія здаўна ганарацца сваёй высокай духоўнасцю,але калі гаварыць папраўдзе, то калі ў Амерыцы гандлявалі чорнымі рабамі, а ў Расіі толькі што адмянілі ганебнае прыгонніцтва,*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Англія ўжо з'яўлялася ўзорам дэмакратычнага ўладкавання, пры якім рашэнні прымаў парламент, пачыналася сур'ёзнае абмеркаванне правоў чалавека, які разглядаўся як вянец тварэння, але ў той жа час лічыўся сам творцам свайго лёсу, а тэхнічны прагрэс, хаця і суправаджаўся балючымі выдаткамі, усё-такі адзначаў сабой новую эпоху ў гісторыі чалавецтва.*

*Заданні для студэнтаў:*

*– пабудаваць структурную схему сказа,*

*– адрэдагаваць сказ,*

*– падзяліць тэкст на некалькі сказаў,*

*– замяніць асобныя словы і інш.*

Дадзеныя прыёмы дазваляюць развіць увагу, свядома засвойваць матэрыял, набыць устойлівыя навыкі працы карэкцыйнага характару з тэкстам.

3. Пры рабоце ў інтраактыўным рэжыме ўсе інфармацыйныя патокі замкнёныя ўнутры навучэнцаў. Гэты рэжым характэрны для самастойнай вучэбнай дзейнасці, пры напісанні сачыненняў, рэфератаў, дакладаў, курсавых, дыпломных работ. *Сутнасць яго ў тым, што пры напісанні тэксту трэба зыходзіць з назвы тэмы, дэталёва апісваючы кожнае слова, пачынаючы з канца фармулёўкі тэмы. Напрыклад, тэма "Мая прафесія ў будучыні". Тэхналагічныя крокі могуць быць наступныя: у пачатку працы студэнты павінны растлумачыць, што такое будучыня, як яны яе бачаць, чым яна адрозніваецца ад мінулага і цяперашняга.*

*Потым трэба растлумачыць, што такое прафесія, чым яна адрозніваецца ад іншых відаў дзейнасці (напрыклад, хобі), сказаць, што існуе некалькі кірункаў дзейнасці (тэхнічны, гуманітарны, эканамічны, прыродазнаўчы і інш.). Затым паказаць, да якога кірунку адносіцца абраная прафесія, і расказаць пра яе.*

*"Мая" – гэты прыналежны займеннік, адлюстроўвае тое асаблівае, што належыць толькі дадзенаму чалавеку, што адрознівае ад іншых людзей. Тут дарэчы будзе растлумачыць, чаму абрана дадзеная прафесія, чым яна падыходзіць менавіта гэтаму студэнту ( па якіх якасцях, крытэрыях і інш.).*

Тэхналагічныя прыёмы гэтай групы развіваюць лагічнае мысленне, дазваляюць студэнтам самастойна выкладаць свае думкі.

**Я.С.Яскевич**, *профессор*

## МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ ПРЕПОДАВАНИЯ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫХ ДИСЦИПЛИН В СОВРЕМЕННОЙ ВЫСШЕЙ ШКОЛЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На рубеже XX и XXI стст. в мировом сообществе остро встал вопрос о становлении единого образовательного пространства, об интеграции позитивных национальных образовательных программ и международной стратегии в контексте универсальных общечеловеческих ценностей и идеалов при бережном сохранении национально значимых приоритетов системы образования.

Каковы эти приоритеты? Каковы механизмы их вхождения в содержательные модели преподавания социально-гуманитарных дисциплин и воспитания молодого поколения? Такого рода вопросы встают сегодня не только перед преподавателями дисциплин гуманитарного цикла в нашей стране, но и перед современным обществом в целом, ибо мировоззренческо-нравственное состояние белорусского общества лишь частный случай глубочайшего кризиса, охватившего человечество. Идеалы христианского братства, любви к ближнему, служения добру, отказа от соблазнов власти, богатства, мирской славы, оптимистические представления о всесилии человеческого разума и социального прогресса, с которыми человечество шло в XX в. и возлагало столько надежд, потерпели крах. Внутренние же проблемы постсоциалистического существования, несомненно, усиливают необходи-